А. А. Ярошык

# ГЕРАІЧНАЯ АБАРОНА БРЭСЦКАЙ КРЭПАСЦІ ЛЕТАМ 1941 Г.

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі г. Мінск, Рэспубліка Беларусь*

У ліку месцаў, дзе адпор ворагу быў аказаны ўжо першы дзень Вялікай Айчыннай вайны, была Брэсцкая крэпасць. Да 22 чэрвеня 1941 г. у крэпасці дыслакавалася 8 стралковых батальёнаў, дзін разведвальны, адзін артылерыйскі полк і два артылерыйскія дывізіёны (СТА і СПА), некаторыя спецыяльныя часткі стралковых палкоў і падраздзяленні карпусных частак, зборы прыпіснога складу 6-й Арлоўскай і 42-й стралковай дывізіі 28 стралковага корпуса 4-й арміі, падраздзяленні 17-га Чырвонанамёнага Брэсцкага пагранічнага атрада, 3-га асобнага інжынернага палка, частка 132-го батальёна канвойных войскаў НКУС, штабы частак (штабы дывізій і 28-га стралковага корпуса размяшчаліся ў Брэсце), усяго каля 9 тысяч чалавек, не лічачы сем'яў вайскоўцаў (300 сем'яў). З нямецкага боку штурм крэпасці быў даручаны 45-й пяхотнай дывізіі (каля 17 тысяч чалавек) 12-га армескага корпуса 2-й армейскай групы пры падтрымцы танкаў, артылерыі і авіяцыі. Крэпасць належала захапіць да 12 гадзін 22 чэрвеня 1941 г. У 4 гадзіны 15 хвілін 22 чэрвеня 1941 г. пачаўся артылерыйскі абстрэл крэпасці. У выніку былі знішчаны склады, вадаправод, перарвана сувязь, нанесены буйныя страты гарнізону. У 4 гадзіны 45 хвілін пачаўся штурм. Нечаканасць атакі прывяла да таго, што адзінага скаардынаванага супраціўлення гарнізон аказаць не змог і быў раздзелены на некалькі частак. Моцнае супраціўленне праціўнік сустрэў на Валынскім і асабліва Кобрынскім умацаванні, дзе справа дайшла да штыкавых атак. Да 7 гадзін 42-я і 6-я стралковыя дывізіі пакінулі крэпасць і г. Брэст, аднак мноству вайскоўцаў гэтых дывізій так і не ўдалося выйсці з крэпасці. Менавіта яны працягвалі змагацца. Па ацэнках даследчыкаў, з крэпасці выйшла каля 6 тысяч чалавек, каля 9 тысяч заставалася ў ёй. Да вечара 24 чэрвеня праціўнік авалодаў Валынскім і Цярэспальскім умацаваннямі, а рэшткі гарнізона апошняга ноччу перапраўіліся ў Цытадэль. Так абарона сканцэнтравался ў Кобрынскім умацаванні і Цытадэлі. На Кобрынскім умацаванні да гэтага часу ўсе абаронцы (каля 400 чалавек пад камандаваннем маёра П.М. Гаўрылава) сканцэнтраваліся ва Усходнім форце. Штодзённа абаронцам крэпасці даводзілася адбіваць 7-8 атак, прычым прымяняліся агнямёты. 26 чэрвеня паў апошні ачаг абароны Цытадэлі каля Трохарачных варот, 29 чэрвеня – Усходні форт. Арганізаваная абарона крэпасці на гэтым скончылася. Заставаліся толькі ізаляваныя групы і адзіночныя байцы. Адзін з надпісаў на сценах крэпасці сцвярджае: «Я умираю, но не сдаюсь. Прощай, Родина. 20/VII-41». 23 ліпеня 1941 г., г.зн. на 32-гі дзені вайны, у палон быў ўзяты маёр П.М. Гаўрылаў, які камандаваў абаронай Усходняга форта, па афіцыйных дадзеных – апошні абаронца Брэсцкай крэпасці. Такім чынам, подзвіг абаронцаў Брэсцкай крэпасці летам 1941 г. стаў яскравым прыкладам патрыятызму і бясконцай адданасці Радзіме. Уклад абаронцаў крэпасці быў ацэнены і палітычным кіраўніцтвам краіны. 8 мая 1965 г. Брэсцкай крэпасці было прысвоена званне крэпасць-герой з уручэннем ордэна Леніна і медалём «Залатая Зорка».

### Список литературы

1. Оборона Брестской крепости [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://3mv.ru/publ/srazhenija/oborona-brestskoj-kreposti/19-1-0-12137. – Дата доступа: 19.03.2020.

*Ярошык Алясей Аляксандравіч*, студэнт 1 курса факультэта інфармацыйных тэхналогій і кіравання БДУІР Mr.alex365@mail.ru
*Навуковы кіраўнік: Мікалаева Людміла Віктараўна*, загадчык кафедры гуманітарных дысцыплін БДУІР, кандыдат гістарычных навук, дацэнт, Mikalayeva@bsuir.by